ЗЕМЛЯКІ

# Святло душы ў суладдзі з талентам



Фота сайта: http://zviazda.by/be/news/20171030/1509383067-zinoviy-prygodzich-pra-maysterstva-publicystyki

Дзея гэтая, сардэчная, трыпяткая і, што немалаважна, высокаінтэлектуальная, адбылася не выпадкова і не спантанна, таму што і яе арганізатары, і галоўны віноўнік дамовіліся аб новай сустрэчы яшчэ год таму. Зіновій Кірылавіч Прыгодзіч тады без усялякіх адгаворак і надуманых прычын адгукнуўся на запрашэнне Пінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Я.Янішчыц і клуба літаратараў Піншчыны «Пінчукі» і выбраў час, каб убачыцца з землякамі. Гэта быў просты і шчыры дыялог аднадумцаў, прыхільнікаў творчасці знакамітага земляка, які маўся праз год адзначыць свой паважаны юбілей. Гэтай нагодай скарысталіся пінчукі і сардэчна запрасілі пісьменніка і журналіста на чарговую сустрэчу. Як і чака-

Якаўлевіч быў удзельнікам вайны. Маці Серафіма Піліпаўна засталася адна з трыма малымі дзецьмі на руках, старэйшаму з якіх не было і пятнаццаці. Цяжка было ўсім, вельмі цяжка. Але ж выстаялі, перамаглі і фашысцкую навалу, і пасляваенныя нягоды. Верылі ў лепшую будучыню, імкнуліся да ведаў, марылі аб жаданых прафесіях. Зіновій Прыгодзіч, юнак са звычайнай сялянскай сям'і, выбраў журналістыку. Да паступлення ў Белдзяржуніверсітэт паспрабаваў свае сілы ў Лагішынскай раённай газеце «Калгасная праўда» ў якасці літсупрацоўніка. Зразумеў, што журналістыка — ягоная прафесія, толькі патрабуе шмат сіл і намаганняў.

Пасля заканчэння журфака ў 1967 годзе пачаў праца-

дзяржаўнага камітэта па друку. Менавіта ў гэты час і адбылося маё знаёмства з Зіновіем Кірылавічам Прыгодзічам.

Дзякуючы яго падтрымцы, яго чалавечнасці і паразуменню ў тыя ліхія дзевяностыя я як малады рэдактар маладой газеты змагла супрацьстаяць наступствам нядобразычліўцаў. За гэта яму асабісты нізкі паклон і вялікі дзякуй.

літаратуры, літаратурнай прэміі «Залаты купідон» і журналісцкай — «Залатое пяро». Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь. Выдатнік друку Беларусі.

А яшчэ З.Прыгодзіч — кандыдат філасофскіх навук. Акадэмік Міжнароднай славянскай акадэміі навук, адукацыі, мастацтваў і культуры. І вядома ж, член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Бела-

лася, Зіновій Кірылавіч з радасцю пагадзіўся.

На гэты раз праграма яго знаходжання на Піншчыне была больш насычанай на прыемныя сустрэчы. Дзесьці за дзве гадзіны да вечара ў бібліятэцы З.К. Прыгодзіч сустрэўся з навучэнцамі Пінскага педагагічнага каледжа. І выступоўца, і слухачы хутка знайшлі агульную мову. Сорак хвілін класнага часу, адведзеных на размову, праляцелі ў адно імгненне. А дзяўчаты і хлопцы ўсё не адпускалі свайго госця. У яго аповедзе ім было цікава ўсё. Навучэнцы і педагогі каледжа з удзячнасцю прынялі і кнігі Зіновія Кірылавіча з дароўным подпісам аўтара.

А потым была доўгачаканая сустрэча ў бібліятэцы. Яе работнікі прыклалі ўсе намаганні, каб знакаміты зямляк адчуваў сябе ўтульна ў запоўненай прыхільнікамі яго таленту аўдыторыі. Выстава яго кніг «Святло душы земляка», кветкі і хлеб-соль да слёз кранулі юбіляра. Ды і сцэнарый дзеі, названай «Падзвіжнік нацыянальнай культуры», быў дасціпным і прадуманым, а вядучыя вечара Кацярына Міхалевіч і Ілля Старадуб настолькі кранальна агучвалі радкі біяграфіі свайго госця, што знаходзілі жывы водгук у прысутных.

Думаю, будзе да месца і мне агучыць важнейшыя падзеі яго жыцця. Нарадзіўся ў маляўнічай палескай вёсцы Лышча, якая на ўсё жыццё засталася яго запаветным куточкам. Бацька Кірыл ваць у старэйшай беларускай газеце «Звязда». Тут Зіновій Прыгодзіч падрыхтаваў і выдаў сваю першую кніжку «На палях Беларусі». Праз хуткі час убачылі свет зборнікі нарысаў «Добры дзень, сад!», «Крылы дужэюць у палёце», «Жменя зярнят», дакументальная аповесць «Строгая дабрата».

У 1977 годзе З.Прыгодзіч перайшоў на работу ў апарат ЦК КПБ, потым паступіў ў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Тры гады ўпарта спасцігаў іншыя дысцыпліны і... пісаў-пісаў — кожную вольную хвіліну пасля лекцый, у выхадныя дні. Аповесць «Журавы на далёкай пойме» атрымалася амаль што аўтабіяграфічнай. А другая — «Ноч перад нядзеляю», задуманая спачатку як гісторыя лёсу адной маці, перарасла ў гісторыю лёсу сучаснай беларускай вёскі.

Пісаў Зіновій Прыгодзіч і вершы, да якіх беларускія кампазітары з задавальненнем пісалі музыку. Дарэчы, некалькі такіх песень у выкананні самадзейных артыстаў прагучалі і падчас свята ў бібліятэцы.

Сваю літаратурную працу Зіновій Кірылавіч працягваў і тады, калі пасля вучобы ў Маскве быў накіраваны на працу ў Мінскую вышэйшую партыйную школу загадчыкам кафедры журналістыкі, мовы і літаратуры.

Потым былі пасада галоўнага рэдактара газеты «Советская Белоруссия» і пасада першага намесніка

Але ж не толькі я адна спазнала цяжкасці. Былі яны і на шляху Зіновія Прыгодзіча. Ды не боязь іх, а хутчэй за ўсё ўменне глядзець далёка ўперад прымусілі З.Прыгодзіча пакінуць, здавалася б, прэстыжную працу і прыняць, на думку многіх, авантурнае рашэнне арганізаваць свой уласны, прыватны часопіс. Як расказвае ён сам у адной са сваіх апошніх кніг з даволі сімвалічнай назвай «Вечаровае», ужо праз некалькі месяцаў, у адзіночку і амаль што на каленях звярстаў ён, а потым і выпусціў першы нумар «Гаспадыні». Напачатку яе тыраж быў каля пяці тысяч, а потым пачаў павялічвацца, бо расла папулярнасць часопіса, ён стаў запатрабаваным у чытача, асабліва калі назва дапоўнілася словамі «Сямейны часопіс». І зараз, праз 25 гадоў існавання, ён займае годнае месца ў медыяпрасторы Беларусі, а тыраж дасягае амаль што 28 тысяч.

І зноў-такі, як лічыць пісьменнік, усё лепшае, што створана ім, напісана ў гады працы ў часопісе. А гэта – трылогія «Постаці», тры кнігі пра літаратуру і літаратараў і шэраг іншых дакументальных твораў.

Літаратурны і журналісцкі набытак Зіновія Кірылавіча Прыгодзіча высока ацэнены на дзяржаўным узроўні. Ён аўтар больш дваццаці мастацкіх і дакументальных кніг. Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, а таксама прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў галіне

рускага саюза журналістаў. Я
не ганарыцца такім землякон

З цеплынёй у адрас ра
чуленага юбіляра гавары
ўдзельнікі вечара-сустрэч
старшыня Лышчанскага сел
скага выканаўчага камітэт
С.А. Лінкевіч, аднакласні
З.Прыгодзіча А.М. Побат
А.У. Кавалёва, былы класн
кіраўнік Я.А. Малашчыцка
педагог дадатковай адукац
дзяржаўнай установы «Лыш
чанская сярэдняя школа» І
Корзун, а таксама член Саю
пісьменнікаў Беларусі і Саю
пісьменнікаў Расіі В.Ф. Грыц
кавец, ваша пакорная слу
ды члены клуба літаратар
Піншчыны «Пінчукі» Ж.М. В
рыч і Л.С. Шклёда. Жада
яму моцнага здароўя, шча
ця, сяброўскага цяпла, пры
нання чытачоў і прыхільнас
крытыкаў.

Гэтаксама цёпла сустрака
пісьменніка і на насту
ны дзень у Лышчанскай с
рэдняй школе. Знаходз
чыся на Піншчыне ў св
юбілейныя дні, З.Прыгодз
не мог не наведацца на сва
малую радзіму, сустрэцца
землякамі і перадаць мясц
вай бібліятэцы свае падарун
— новыя кнігі.

Здаецца, і жыццёвы шл
за плячыма ў юбіляра нем
лы, і зроблена шмат.

Але пакуль хапае ў яго с
ведаў, вопыту, жадання і
наперад, ён ідзе — з добры
сэрцам і светлаю душою.
мы будзем спадзявацца
новыя сустрэчы з ім.

**Марыя ЛЯШУ**
**член Саюза пісьменнік**
**Белару**